формации; ни текст, ни фонозапись, ни даже озвученные диафильмы не могут предъявить иноязычную речь (например, диалогическую) так совершенно, как это делает экран. Видиозаписи цередач, транслируемые по телевидению, просматриваются и обсуждаются на занятиях в удобное время. С помощью видиоматериалов происходит обобщение и образование — на основе умственных действий — речевых и мыслительных стереотипов, так как при использовании видиофонограмм увиденное и услышенное обсуждается с опорой на внутреннюю наглядность.

УДК 808.26-07

Г.Ф.Швед, выкладчык кафедры
беларускай мовы

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ТЭХНІЧНЫХ ВНУ

The article deals with the teaching problems of Byelorussian language as the subject of numanitarian trend. It aims at training of highly skilled creative and nationally intelligent person. It is proved that there is no general culture if a man doesn't know his own national language and culture.

Асноўная мэта навучання мове - сфармаваць высокую моўную і маўленчую культуру, навучыць карыстацца родным словам. Не менш важнай задачай працэсу выкладання роднай мовы, асабліва ў тэхнічных ВНУ, дзе прадметы гуманітарнага цыкла прадстаўлены не так шырока, з'яўляецца выхаванне, падрыхтоўка высокаадукаванай, творчай, нацыянальна свядомай асобы. А менавіта родная мова - гэта сродак пазнання, развіцця і выхавання.

Беларускі народ у сваёй мове, міфалогіі, вусна-паэтычнай творчасці, літаратуры, мастацтве выказаў і пакінуў у спадчыну нашчадкам сваё разуменне каштоўнага, разумнага і прыгожага. У беларускай мове, як і ў іншых мовах народаў свету, адлюстравана адзіная самабытная і непаўторная карціна бачання свету. Усё гэта надае мове карэннага насельніцтва на тэрыторыі рэспублікі асаблівае значэнне. Трэба зразумець, што гэты прадмет выкладаецца не столькі і не толькі дзеля таго, каб навучыцца выконваць усе віды граматычнага разбору, колькі для таго, каб дапамагчы студэнтам авалодаць літаратурнай моваЙ ва ўсёй складанай шматграннасці і самабытнасці формаў яе існавання.

У працэсе выкладання мовы вырашаюцца такія спецыфічныя задачы, як фармаванне сапраўдных грамадзян, удумлівых чытачоў, адукаваных суразмоўцаў, спагадлівых высакародных людзей. Адбываецца выпрацоўка

ў слухачоў высокай нацыянальнай свядомасці праз далучэнне іх да нацыянальнай мовы і культуры, народнай этыкі, духоўнасці і маралі.

Мова - гэта прыкмета, па якой мяркуюць пра ўзровень культуры чалавека, яго інтэлект, характар, сацыяльную прыналежнасць, імкненні, жаданні і захапленні. Таму вельмі важна ў час маўлення захоўваць не толькі арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя і граматычныя нормы, але і этычныя, што неабходна для лепшага ўзаемаразумення паміж людзьмі.

Такім чынам, моўная і маўленчая культура ўключае ў сябе не толькі лінгвістычныя веды, уменні і навыкі, але і маўленчыя, а гэта - успрымаць змест і форму выказвання на слых і пры чытанні, аналізаваць вусныя і пісьмовыя тэксты, ствараць свае тэксты розных стыляў.

Даказана, што самым надзейным паказчыкам дасведчанасці чалавека ў той ці іншай галіне навукі ці практыкі з'яўляецца яго ўласнае выказванне.

Таму менавіта выказванне лічаць вышэйшым этапам свядомай маўленчай дзейнасці асобы, а таксама этычныя - гэта тактоўна весці размову, пераконваць, не згаджацца ў межах этычных нормаў. Адным словам, гэтыя тыпы ведаў сведчаць аб адукаванасці, выхаванасці і культуры і ствараюць высокаадукаваную, творчую асобу.

Гэта дасягаецца выкарыстаннем актыўных форм навучання, калі ствараецца пазнавальная дзейнасць студэнта, навучанне становіцца яго ўласнай справай. Усё гэта накіравана на:

- самаадукацыю, самапазнанне, творчую самастойнасць;
- выхаванне цікавасці да прадмета;
- стварэнне атмасферы супрацоўніцтва;
- актывізацыю маўленчай дзейнасці.

На падставе гэтага выкладчыкамі кафедры беларускай мовы нашага універсітэта праводзіцца работа па выхаванню творчай высокаадукаванай і нацыянальна свядомай асобы. Шырока развіваецца вуснае маўленне, студэнты выказваюцца па грамадскіх, экалагічных і іншых жыццёвых пытаннях, у якасці допуску да экзамена кожны з іх напісаў рэферат па індывідуальнай тэме, з гісторыі і сучаснасці Бацькаўшчыны, аб знакамітых людзях, якія жылі і жывуць на Беларусі. У гэтай іх самастойнай працы вельмі дапамагла міні-бібліятэка, створаная на аснове лабараторыі кафедры беларускай мовы, дзе студэнты карысталіся патрэбнай літаратурай і атрымлівалі змястоўныя кансультацыі ад выкладчыкаў.

Ва універсітэце падтрымліваецца сувязь атрыманых ведаў у школе з набытымі ў цяперашні час праз правядзенне алімпіяды па беларускай мове: I тур - па групах, II тур - агульнауніверсітэцкі. Кафедра беларускай мовы праводзіць сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі і навукоўцамі, арганізоўвае прагляд спектакляў у тэатрах горада.

Існуюць думкі замежных і айчынных вучоных, што сацыяльнае жыццё чалавека залежыць пераважна ад узроўню яго адукаванасці ў шырокім аспекце. І вось менавіта ўкараненне гуманітарнага цыкла, а сярод яго адно з першасных месцаў займае родная мова як прадмет, у тэхнічных ВНУ мае вялікае значэнне. Не можа быць культура агульнай без ведання чалавекам мовы і культуры нацыянальнай.

## СОДЕРЖАНИЕ

**В.С.Вихренко.**
СЛОЖНОСТИ АДАПТАЦИИ СТУДЕНТОВ К ИЗУЧЕНИЮ ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ И ОБЩЕИНЖЕНЕРНЫХ ДИСЦИПЛИН И ПУТИ ИХ ПРЕОДОЛЕНИЯ .......... 3

**В.А.Ашуйко, Т.А.Матвеева.**
ВОПРОСЫ АДАПТАЦИИ СТУДЕНТОВ I КУРСА ПРИ ИЗУЧЕНИИ ДИСЦИПЛИН "ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ХИМИИ" И "НЕОРГАНИЧЕСКАЯ ХИМИЯ" .......... 8

**О.Б.Дормешкин.**
РАЗРАБОТКА СИСТЕМЫ НЕПРЕРЫВНОГО ОБУЧЕНИЯ И ИСПОЛЬЗОВАНИЯ САПР В ПРОЦЕССЕ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ ТЕХНИЧЕСКОГО ПРОФИЛЯ .......... 12

**П.Я.Вайцяховіч.**
ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ ТЭОРЫІ РАШЭННЯ ВЫНАХОДНІЦКІХ ЗАДАЧ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ .......... 16

**В.Л.Колесников, Н.Н.Пустовалова, Т.П.Брусенцова, Т.В.Кишкурно.**
ИМИТАЦИОННЫЕ И ОБУЧАЮЩИЕ КОМПЬЮТЕРНЫЕ ПРОГРАММЫ ПО ЭКОЛОГИЧЕСКОМУ ОБРАЗОВАНИЮ .......... 18

**Н.И. Гурин.**
ИСПОЛЬЗОВАНИЕ МУЛЬТИМЕДИЙНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ ДЛЯ РАЗРАБОТКИ ОБУЧАЮЩИХ И ИНФОРМАЦИОННЫХ СИСТЕМ .......... 22

**П.П. Урбанович, Н.И. Гурин.**
ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ РАЗВИТИЯ ВЫЧИСЛИТЕЛЬНОЙ ТЕХНИКИ В БГТУ И ПУТИ ИХ РЕАЛИЗАЦИИ .......... 26

**В.А.Кузьміч.**
УДАСКАНАЛЕННЕ ТЭХНАЛОГІІ ВЫКЛАДАННЯ ПРАДМЕТАЎ ГУМАНІТАРНАГА ЦЫКЛА Ў ТЭХНІЧНАЙ ВНУ .......... 30